Любоў Турмасава

Загадчыца аддзела
Гродзенскай абласной
навуковай бібліятэкі
імя Я.Ф. Карскага




# «Мужыцкая праўда» – першая газета на роднай мове

Ужо сёмы год Гродзенская абласная бібліятэка імя Я.Ф. Карскага збірае навукоўцаў, краязнаўцаў, супрацоўнікаў музеяў, бібліятэк ды студэнцкую моладзь, каб ушанаваць найбольш адметныя падзеі ў гісторыі нашай любай Гародні і Гарадзеншчыны. Гэтай высакароднай мэце служаць Гарадзенскія чытанні. Сёмыя Гарадзенскія чытанні былі прымеркаваны да 150-годдзя з пачатку выдання газеты «Мужыцкая праўда» – першай газеты на беларускай мове, амаль ўсе нумары якой выйшлі на тэрыторыі Гродзеншчыны. «Мужыцкая праўда» адыграла вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі паўстання 1863–1864 гг. Яна ўпершыню на роднай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялянства, выхоўвала яго ў духу нянавісці да прыгонніцтва і самадзяржаўя, заклікала на барацьбу з імі. Анатоль Смірноў, аўтар вялікай колькасці прац пра паўстанне і Кастуся Каліноўскага, называў «Мужыцкую праўду» «першым зваротам з вольным і праўдзівым словам да селяніна-беларуса на ягонай роднай мове».

У 1862–1863 гг. газету выдавалі К. Каліноўскі, Ф. Ражанскі, С. Сангін, В. Урублеўскі. Выйшла 7 нумароў. Газета друкавалася ў выглядзе лісткоў невялікага фармату значным накладам. Распаўсюджвалася амаль па ўсёй Беларусі, у Літве і Латвіі. Кожны нумар падпісваўся псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні».

Усе нумары «Мужыцкай праўды» прасякнуты важнейшым пытаннем эпохі – пытаннем зямлі і волі, пафасам барацьбы за свабоду. Газета заклікала беларускі народ да ўзброенай барацьбы супраць самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу, заклікала беларускіх сялян падтрымліваць польскі нацыянальна-вызваленчы рух і адначасова вырашаць свае ўласныя задачы.

Адкрыў Сёмыя Гарадзенскія чытанні начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі. Ён адзначыў, што газета «Мужыцкая праўда» з'яўлялася рэвалюцыйнай у думках людзей таго часу. Даследчыкі называлі газету «набатам паўстання 1863–1864 гг.».

У дакладах аналізавалася роля «Мужыцкай праўды» ў развіцці беларускай культуры, газета разглядалася як узор мастацкай публіцыстыкі. Прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч падкрэсліў значнасць газеты, «якая загаварыла мовай свайго народа». Гэта літаратурная з'ява поўнасцю арыгінальная і наватарская. Рознабаковасць газеты паўплывала на развіццё беларускай літаратуры. Шэраг дакладаў раскрываў змест першай газеты на беларускай мове: эканамічныя, грамадска-палітычныя, рэлігійныя праблемы; знаёміў з яе распаўсюджвальнікамі; прадстаўляў беларускамоўныя выданні 1860-х гг. Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віктар Белазаровіч бліскуча зрабіў агляд гістарычных крыніц па вывучэнні «Мужыцкай праўды». Уплыў паўстання 1863–1864 гг. на культурнае жыццё Гродзеншчыны быў раскрыты ў дакладах прафесара Святланы Куль-Сяльверставай і дацэнта Віталя Карнелюка. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і тэматыка перыядычнага друку на гарадзенскіх землях былі паказаны ў дакладах кандыдатаў гістарычных навук Святланы Сілавай, Аляксандра Богуша, Сяргея Амелькі. Палемічнай і вострай была дыскусія падчас падвядзення вынікаў чытання.

Цікавасць выклікаў адкрыты прагляд «"Мужыцкая праўда" – першая дэмакратычная газета на роднай мове», які быў падрыхтаваны аддзелам краязнаўства сумесна з аддзелам рэдкіх кніг і старадрукаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. У першым раздзеле «Мужыцкая праўда ў кантэксце беларускай культуры» прадстаўлены тэксты самой газеты і вынікі даследаванняў навукоўцаў «Мужыцкай праўды», якія месцяцца ў самых разнастайных крыніцах: энцыклапедычных выданнях, манаграфіях, зборніках навуковых прац, падручніках і вучэбных дапаможніках. Другі раздзел «Перыядычны друк Гродзеншчыны» адлюстроўвае газеты нашага рэгёна, пачынаючы ад «Газеты Гродзеньскай» і заканчваючы сучаснымі. Шырока паказана перыёдыка міжваеннага перыяду на беларускай, польскай, рускай мовах і, нават, іўрыце. Тут прадстаўлены і выданні, якія раскрываюць вынікі даследаванняў навукоўцаў і журналістаў аб развіцці перыядычнага друку на гарадзенскіх землях.

Summary

The article is devoted to the history of the first newspaper in Belarusian language «Muzhytsky Prauda» which was issued 150 years ago and throughout the period of its existence propagandized revolutionary-democratic ideas.